# Гісторыя вёскі Корнадзь




Балота, непраходнае, няўстойлівае, распасціралася на дзясяткі кіламетраў. Ушчыльную падыходзіла з усіх бакоў да вёскі. Корнадзь была невялікім востравам сярод велізарнага мора балот і вады. Адзіная вуліца абодвумя канцамі ўпіралася ў балота. Дваццаць пяць дамоў, цесна прытуліўшыся адзін да аднаго з роспачу і асуджэннем, пазіралі на свет сваімі акенцамі.

Чорныя хмары мошак і камароў з тоўстай заслонай віселі над вёскай амаль круглы год. Старажылы ўспаміналі, як зімовымі вечарамі па заснежанай вуліцы блукалі ваўкі. Выйсці за парог хаты, калі пачынала змяркацца, ніхто з вяскоўцаў не адважваўся. Зямля, з цяжкасцю адваяваная ў балота, радзіла скудна. Хіба што ў засушлівы год, калі вада адступала, можна было ўдосталь сабраць хлеба і бульбы.

Сёння ніхто не памятае, калі і хто заснаваў Корнадзь. І чаму яе пачалі называць так. Некаторыя кажуць: жыў некалі тут пан Карнач, і з яго прозвішча пайшла назва вёскі. Іншыя сцвярджаюць: працякала непадалёку ад гэтых мясцін рака Корнадка, і, менавіта, яна дала назву вёсцы. А трэція гавораць, што назва гэтай вёскі пайшла ад слоў “карэнні”, “карчы”. А гэтага дабра тут хапала.

Паводле звестак з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) ў Гродне: Першапачаткова вёскі Корнадзь не існавала. Быў толькі фальварак з такой назвай. Звесткі аб існаванні фальварка Корнадзь адносяцца да канца XVII ст., як уладанне пані Крыстыны Кунцэвіч. Вядома, што Крыстына Феліцыяна Вайнянка Кунцэвіч (памерла ў 1685 г.), жонка ваяводы брэсцкага Якуба Тэадора Кунцэвіча валодала мястэчкам Лыскава, вёскай Куклічы і іншымі навакольнымі землямі, пабудавала і перадала манахам уніяцкага базыліянскага ордэна царкву і манастыр, куды яны і засяліліся 2 чэрвеня 1682 г. У гэтым жа годзе яна падарыла фальварак Корнадзь Лыскаўскаму манастыру базыліян (базыліяне – манахі ордэна каталіцкай царквы з праваслаўным абрадам) разам з карчмой, вёску Куклічы з 13 прыгоннымі сялянамі, а таксама фальварак Адзінцоўскі на сад і выпас жывёлы, а ў самім Лыскаве – млын з млынаром. Апошнія для вядзення гаспадаркі пасялілі ў фальварку некалькі сялян з суседняй вёскі Куклічы, яны і сталі продкамі сучасных жыхароў Корнадзі. Пасля закрыцця манастыра ў 1835 г. фальварак стаў дзяржаўным маёнткам і пазней вырас да вёскі, а яго жыхары былі пераведзены ў разрад дзяржаўных сялян.

Пра тое, што базыліянам належалі фальварак Корнадзь і млын, захоўвалася памяць яшчэ праз два стагоддзі пазней. Так, у “Царкоўным летапісе Лыскаўскай царквы”, пачатым у 1880 г., можна прачытаць наступнае: “В приходе есть водяная

деревянная мельница на ручейке Чимбе. Она отошла во владение причта по закрытии костёла. В настоящее время эта мельница очень ветха и в таком состоянии отдаётся в арендное содержание в пользу причта по 100 рублей в год. Верстах в 10-и от м. Лыскова есть имение Корнедзь. Прежде оно принадлежало Лысковским базилианам, а с закрытием униатского базилианского монастыря перешло в казну и с него теперь получается причтом 320 руб. в год".

Было ўстаноўлена, што з 1682 г. па 1835 г. фальварак Корнадзь належаў Лыскаўскаму манастыру базыліянаў. Выяўлены звесткі пра абставіны іх з'яўлення , гаспадарчую і адукацыйную дзейнасць як на тэрыторыі ўсяго ВКЛ, так і ў мястэчку Лыскава Ваўкавыскага павета.

Дапаўняючыя звесткі знаходзім ў "Рэестры падатку падымнага павета Ваўкавыскага за 1690 г.", дзе сказана, што "Вялебны Айцец Сяргейкевіч, старшы канвенту Лыскоўскага Святога Базыля, з фундацыі вячыстай з вёскі Кукліч" заплаціў падатак "за шэсць дымоў, а з застаўных ад яго мосці пана ваяводзіча з Лыскава – за тры дыма". Такім чынам, на гэты год лыскаўскія базыліяне працягвалі валодаць падараваннямі Крыстыны Кунцэвіч, плацілі ў казну падатак за дзевяць дымоў, ў тым ліку і за Корнадзь.

У справе № 858 – "Інвентарны вопіс Лыскаўскага манастыра ксяндзоў базыліянаў ад 10 мая 1758 г." маецца: "Вымяр грунтов фольварка Корнадзь кляшторных", з якога мы даведваемся, што непасрэдна ў склад фальварка ўваходзілі тры асобных участка ворыўнай зямлі агульнай плошчай 72 моргі (морг – адзінка вымярэння плошчы ў ВКЛ, роўная 0,71 га ): першы памерам 34 моргі, другі – 8 і трэці – 30 моргаў. Такім чынам, агульная плошча зямель фальварка ў пераводзе на сучасныя адзінкі складала 51, 12 га. У тым жа архіве маюцца Рэвізскія сказкі 1795 і 1811 гг., з якіх можна даведацца аб тым, хто жыў у фальварку ў тыя далёкія часы. Так, у 1795 г. у Корнадзі жыло толькі 6 чалавек: тры мужчыны і тры жанчыны, двое з гэтых шасці адносіліся да шляхецкага стану: эканом Юзаф Немчыновіч (47 год, выбыў з паслугі ў 1797 г.) і адміністрыня Разалія Калупайлава (35 год). Трое былі прыгоннымі сялянамі: пастушок Якаў, сын Мацея Лічыка (9 год), дзеўка Луцыя, дачка Пракопа Васіліцы (25 год) і Паланея Саўкоўна (18 год). Парабак Сымон Галандзюк (32 гады, выбыў з паслугі ў 1796 г.) быў вольнага стану. Немчыновіч і Калупайла – распаўсюджаныя ў Ваўкавыскім павеце ў XVIII-XIX стст. шляхецкія прозвішчы. Прозвішчы Лічык і Саўко і зараз шырока распаўсюджаны сярод жыхароў Корнадзі".

У 1890 г. Корнедзь – маёнтак (507,5 дзесяцін зямлі, уладанне С.Славуцінскага) і вёска (у складзе Кукліцкага сельскага таварыства, разам з жыхарамі в.Куклічы вяскоўцы валодалі 566,25 дзесяцінамі зямлі) у Лыскаўскай воласці Ваўкавыскага павета Гродзенскай губерніі.

Паводле перапісу 1897 г. вёска (10 двароў, 73 жыхары) і маёнтак (2 двары, 21 жыхар).

У 1905 г. у вёсцы 115 жыхароў, у маёнтку 3 жыхары.

У 1914 г. у вёсцы 173 жыхароў, у маёнтку 22 жыхары.

З восені 1915 г. акупіравана германскімі войскамі.

З 01.01.1919 г. – у БССР, з лютага 1919г. – у Літоўска-Беларускай ССР.

З красавіка 1919 г. акупіравана польскімі войскамі, у ліпені 1920 г. вызвалена Чырвонай Арміяй, у верасні – зноў занята польскімі войскамі.

З сакавіка 1921 г. – у складзе Лыскаўскай гміны Ваўкавыскага павета Беластоцкага ваяводства Польшчы.

У верасні 1921 г. фальварак (1 жыхар) і вёска (14 двароў, 61 жыхар).

З ліпеня 1939 г. – у БССР, з 04.12.1939 г. – у Брэсцкай вобласці, з 15.01.1940 г. – у Поразаўскім раёне, з 12.10.1940 г. – у Кукліцкім сельсавеце.

У 1940 г. у вёсцы 40 двароў, 123 жыхары, пачатковая школа, у былым фальварку 1 двор, 3 жыхары.

У Вялікую Айчынную вайну з канца чэрвеня 1941 г. да 15ліпеня 1944 г. Корнадзь акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**З успамінаў Вольгі Міхайлаўны Анісеня:** “Немцы адразу ж аб’явілі свае парадкі. У першую чаргу яны пачалі забіраць у людзей кароў, коней, курэй, прадукты харчавання. Яны не цацкаліся з тымі, хто не паддаваўся ўгаворам, а ператвараліся ў жывую мішэнь. “Новая ўлада” не адчувала ніякага супраціву насельніцтва, таму што звычайныя сяляне, якія жывуць у сваіх паўсядзённых праблемах, не толькі маглі зрабіць што-небудзь, але і зразумець.

Вёска Куклічы гарэла яркім полымем, а ў Корнадзі ад выбухаў гітлераўскіх снарадаў стагнала зямля. У бацькоўскім доме (ёй было ўсяго 13 гадоў) пасыпалася шыба. Сям’я пачала ўцякаць да суседзяў, толькі бацька застаўся ў стайні паіць каня. Выходзячы на вуліцу яго застрэлілі фашысты. Бацьку за ногі цягнулі ў агарод людзі ў форме, а за яго целам цягнуўся пунсовы шлейф крыві…

Няма болей даху над галавой, а самае страшнае – няма бацькі, а на руках у маці два сыны і дачка, якія выжылі ў жудасным агні вайны і пабароўшыя тыф, якім перахварэлі многія. Але трэба жыць далей. І мы жылі, блукаючы па суседзях, гаравалі пра страчанае.

Фашысты працягвалі здзяйсняць свае чорныя справы, але ім не дазвалялі вольна жыць партызаны, якія знаходзіліся ў суседнім лесе. Улетку 44-га яны застрэлілі афіцэра-гітлераўца, але за гэты ўчынак прыйшлося заплаціць сваім жыццём 22 мужчынам і 2 жанчынам з вёскі, у тым ліку і мае старэйшыя браты – Міхаіл і Васіль Кердоль. Усіх гэтых людзей пад дулам аўтаматаў завялі ў маленькае памяшканне і закрылі на два дні, а пасля знясіленых і галодных даставілі ў вёску Лыскава, дзе знаходзілася галоўнае логава фашыстаў. Там сяляне правялі яшчэ адну, апошнюю, ноч. А раніцай яны пачулі, як непадалёку рыдлёўкамі капаюць зямлю...

Яма была даўжынёй каля 40 метраў і 4 шырынёй. Да яе акупанты павялі на расстрэл заложнікаў з усёй акругі. Іх было больш за 70 чалавек. Целы падалі ў чорную свежавыкапаную яму. Многія былі толькі паранены, а гэта значыць, асуджаны быць пахаванымі зажыва. Пасля таго, як апошні ўзмах рыдлёўкі поўнасцю пакрыў пяском целы, зямля яшчэ некалькі гадзін працягвала варушыцца, выдаючы глухія стогны…”.

**З успамінаў Марыі Васільеўны Сушко**: “Завязаўся жорсткі бой. Рваліся снарады, вакол стралялі. Зямля гарэла, хаты гарэлі. А калі заціхлі адгалоскі бою, і людзі адважыліся вярнуцца дадому, на месцы іх дыміўся чорны попел. Сям’е давялося жыць у яме, дзе захоўвалася бульба, у зямлянцы, а потым было восем

доўгіх і цяжкіх гадоў тулянняў па чужых кутах у пошуках хаця б часовага прытулку.

Першым у барацьбе прыняў удзел мой старэйшы брат Грыша, які да вайны працаваў у міліцыі – ён далучыўся да падполля. Да яго сталі прыходзіць незнаёмцы. І калі я стала распытваць брата, хто гэтыя людзі і адкуль яны, брат, не хаваючыся, распавёў пра падпольшчыкаў і партызанаў. І таксама рашуча ўключылася ў барацьбу з захопнікамі і стала сувязной у партызан. Мне даводзілася супрацоўнічаць з Шабатам Аляксеем з Сабалькоў, сям'ю якога пазней расстралялі немцы, з Янушкам, якога ведала пад мянушкай "Паддубны". Лагер партызан размяшчаўся ва ўрочышчы "Доўгі Бор", адкуль прыязджалі да мяне партызаны, каб даведацца пра месцазнаходжанне немцаў і іх перамяшчэннях. А яшчэ даводзілася клапаціцца аб параненых партызанах, якіх ноччу прывозілі ў сяло. Рызыкуючы сваім жыццём і жыццём усёй сваёй сям'і, клапацілася аб параненых, часта аддаючы ім апошні кавалак хлеба.

У той суровы час ўвайшла ў Савет камсамольскай арганізацыі. Камсамольскі білет быў атрыманы ў жніўні 1943 года Поразаўскім райкамам камсамола".

**З успамінаў Аляксандры Аляксееўны Саўко:** "Я павезла ў Лыскава малоць зерне на мельніцу. У гэты час недзе ў ваколіцах забілі паліцая, і немцы пачалі аблаву на мірных жыхароў. Даведаўшыся, што я з Корнадзі, мяне затрымалі і пагналі з групай арыштаваных у Ваўкавыск. Адтуль папала ў Германію. Працавала ў гаспадароў. Капала і сушыла торф з такімі ж як сама нявольнікамі з Беларусі. Карміла свіней, выконвала самую чорную і цяжкую працу. Жылі нявольнікі упрогаладзь, за малую правіннасць гаспадар караў, сцёбаючы плёткай. Вярнуўшыся з прымусовых работ, даведалася, што ў Ваўкавыску мяне, не вярнуўшуюся дамоў з мельніцы, шукаў бацька, каб перадаць вопратку і ежу. Дзякуючы таму, што выехаў на два дні з Корнадзі, ён і застаўся жывым. Таму што, у вёску прыехалі немцы і пагналі жыхароў быццам бы на сход. Усіх закрылі і назаўтра павялі ў Лыскава, адтуль ужо ніхто не вярнуўся".

У гады вайны ваколіцы Корнадзі былі краем партызанскім. 26 жыхароў вёскі былі расстраляны ў адзін дзень нацыстамі за сувязь з партызанамі. Хіба маглі яны падумаць, што цішыню іх мірнага жыцця парушыць гул самалётаў і шум танкаў, што ў 1941 г. тут будзе праходзіць лінія фронту, а ў суседняй вёсцы Куклічы фашысты зоймуць высату, дзе быў пабудаваны маяк, які бачыў усё сваім яркім вокам за некалькі кіламетраў? Ды і Корнадзь не мінавалі акупанты, а на працягу 7 тыдняў яны спыніліся ў будынку кузні – былой сядзібы памешчыка. Гэтыя 7 тыдняў сталі ракавымі для многіх ...

Ужо на другі дзень пасля нападзення фашысцкай Германіі на СССР жыхары вёсак Сабалькі і Куклічы, былыя дзеячы КПЗБ В.В.Янушка, С.К.Куцько, А.С.Саўко наладзілі сувязь з 37 сваімі таварышамі з навакольных вёсак. Быў створаны антыфашысцкі камітэт, кіраванне якім даручылі В.В.Янушку. Група пад яго кіраўніцтвам разгарнула актыўную антыфашысцкую дзейнасць. Збіралі зброю, вялі прапаганду сярод насельніцтва, наладжвалі сувязь з дзеючымі ў тыле ворага салдатамі і афіцэрамі Чырвонай арміі. Члены антыфашысцкага камітэта перадалі партызанам 9 кулямётаў, 58 вінтовак, 90 кг трацілу, 35 гранат і шмат іншай зброі.

Новы этап у развіцці партызанскага руху на Беларусі наступіў восенню 1943 г. Да гэтага часу шматлікія партызанскія атрады былі разрознены, таму ўзнікла неабходнасць у аб'яднанні і каардынацыі іх дзейнасці.

У лясным масіве ў ваколіцах вёскі Корнадзь і ў Церахавіцкім лесе дзейнічала брыгада імя Чапаева.

Вось некаторыя баявыя дзеянні брыгады. Вечарам 2 лістапада атрад імя Жукава, абмінуўшы Новы Двор, дзе размяшчаўся нямецкі гарнізон, увайшоў у Белавежскую пушчу. Група разведчыкаў выявіла, што каля ўрочышча Войтаў Мост немцы абсталявалі аэрадром для прыёму лёгкіх самалётаў. Усе вёскі і населеныя пункты ў пушчы фашысты знішчылі. На зваротнай дарозе разведчыкі натрапілі на засаду. Завязаўся бой. Фашысты спешна адступалі, не ведаючы колькасці партызан. Атраду пасля гэтай сутычкі давялося перадыслакавацца. Ведаючы, што цяпер гітлераўцы будуць арганізоўваць карныя акцыі, штаб атрада распрацаваў мерапрыемствы па абароне. Былі ўстаноўлены "сакрэты", намечаны шляхі адыходу ў выпадку раптоўнага нападзення ворагаў. І сапраўды, праз некалькі дзён "сакрэты" паведамілі ад руху да месца дыслакацыі атрада вялікай групы фашыстаў. Падпусціўшы немцаў на блізкую адлегласць, партызаны адкрылі шквальны агонь, знішчыўшы 30 гітлераўцаў.

Затым пачалося адступленне. Ішоў мокры снег, партызаны рухаліся ў балотнай вадзе. Ноччу яны выйшлі да Новага Двара. Разведка паведаміла, што ў вёсцы засада. Пераадолеўшы ўброд невялікую рэчку, атрад наблізіўся да вёскі Сабалькі. Тут была наладжана сувязь з В.В.Янушкам, атрыманы звесткі аб размяшчэнні немцаў. Затым атрад перайшоў у Ружанскую пушчу, дзе злучыўся са штабам брыгады.

Да мая 1944 г. брыгада імя Чапаева размяшчалася ва ўрочышчы Гута-Міхалін.

У мястэчку Лыскава фашысты атрымалі боепрыпасы і вярталіся ў Новы Двор, дзе знаходзіўся іх гарнізон. Менавіта тут, на дарозе, была арганізавана засада. Партызаны знішчылі 40 гітлераўцаў і з багатымі трафеямі адышлі да Корнадзі.

Кровапралітныя баі вяла брыгада імя Чапаева з 29 па 31 мая 1944 г. у час карнай нямецкай экспедыцыі. Раніцай 29 мая дзве тысячы салдат вермахта і паліцыі акружылі партызан ў раёне вёскі Парахаўня. Але партызаны падрыхтаваліся да сустрэчы з ворагам. Пасля першай няўдалай атакі з боку дарогі Лыскава – Новы Двор немцы паспрабавалі атакаваць яшчэ раз. Брыгада была вымушана адступіць і заняць новую пазіцыю. 30 мая група разведчыкаў наткнулася на засаду. У баі загінулі 7 партызан, адзін быў паранены. Разведка паведаміла, што на наступны дзень фашысты рыхтуюць новае "прачэсванне" Белых балот (так называўся раён выспаў і балоцістай часткі пушчы). Камандаванне брыгады вырашыла зноў перайсці ва ўрочышча Гута-Міхалін.

Імёны ўсіх загінуўшых напісаны на халодных плітах у вёсцы Лыскава і ў раённай кнізе "Памяць".

З 20.09.1944 г. вёска ў складзе Гродзенскай вобласці.

У 1950 г. на корнадзьскіх землях быў заснаваны калгас "Маладая гвардыя". Першым сваім кіраўніком аднавяскоўцы выбралі Уладзіміра Сцяпанавіча

Кучынскага. Нямала сіл і энэргіі аддаў ён арганізацыі калектыўнай гаспадаркі. Калгаснікі арцелі “Маладая гвардыя” мелі ў сваім распараджэнні 150 гектараў зямлі. Апрацоўвалі яе 20 коньмі. Аб трактары толькі марылі.

У 1959 г. налічваецца 155 жыхароў.

З 20.01.1960 г. вёска знаходзіцца ў Свіслацкім раёне, з 02.12.1961 г. – у Ханявіцкім сельсавеце.

У 1962 годзе была пабудавана новая пачатковая школа.

У 1970 г. – 168 жыхароў.

З 29.12.1979 г. – у Навадворскім сельсавеце.



Прамень святла і надзеі з’явіўся ў людзей, калі на гэту зямлю ў 1974 г. ступілі меліяратары.

З загада па Міністэрству сельскай гаспадаркі БССР №459-К ад 16 кастрычніка 1974 г.: “Арганізаваць саўгас на базе вытворчага ўчастка “Корнадзь” калгаса “Світанне”.

Няўжо канец гэтай балотняй, непраходнай цьме? Няўжо чалавек можа перамагчы саму прыроду, падчыніць яе сабе?

І загудзелі-заракаталі магутныя трактары і машыны ў аколіцах Корнадзі. На сваім вяку нічога падобнага не бачыла яснавокая рака Ясельда, у вярхоўях якой пачалося будаўніцтва саўгаса “50 год Кастрычніка”.

Восем машын і дванаццаць трактараў пачалі тут “балотную рэвалюцыю”. Тыя, хто першым прыйшоў на гэту зямлю добра помняць, як правальваліся ў багну трактары і бульдозеры, як даймаў камарыны гнус, як радаваліся першым асушаным гектарам.





Фашчыннае умацаванне канаваў перашкаджае заплыванню іх грунтам.





Вось такімі канавамі балота было разбіта на карты. У іх сцякала вада, аддаючы чалавеку каштоўныя гектары зямлі.

Быў пабудаваны першы адміністрацыйны будынак. Адсюль ішло кіраванне усімі меліяратыўнымі работамі і будаўніцтвам новай сучаснай вёскі. І пачалі ехаць сюды людзі, маладыя, поўныя сіл і энэргіі. Жылі яны напачатку ў вагончыках і бараках.



*Будынак канторы саўгаса “50 год Кастрычніка”, 1974 г.*

Велізарная праца была ўложана людзьмі ў гэтыя тарфяныя землі. І ўсё для таго, каб потым нешта атрымаць узамен.







А зямля як бы толькі таго і чакала, каб яе прыбралі да рук, па-гаспадарску распарадзіліся і паклапаціліся аб ёй, не скупілась яна на добрыя ўраджаі.

Да 1984 г. было асушана 4307 га зямлі. З іх 3402 га было згорана пад сельскагаспадарчыя культуры.

Тэрыторыя саўгаса “50 год Кастрычніка” размяшчалася ў паўднёва-

усходняй часцы Свіслацкага раёна. Пераважная частка тэрыторыі размешчана на Свіслацка-Навадворскай раўніне. Яна сфарміравалася ў выніку дзейнасці ледніковых вод. Асноўная паўднёвая частка гаспадаркі прадстаўлена затарфаванай нізінай. У сувязі з неаднаразовай разнастайнасцю форм рэльефа ствараюцца розныя ўмовы для працэсаў почваствярэння, пачынаючы ад дзярнова-падзолістага тыпу на павышаных участках рэльефа і канчаючы балотным тыпам на паніжэннях паўднёвай часткі тэрыторыі.

Да асушэння на тэрыторыі гаспадаркі працякала рэчка Парахаўня, русла якой выпрамлена і з'яўляецца водапрыемнікам. Каля вёскі Корнадзь працякае ручэй Безыменны.

У саўгасе "50 год Кастрычніка" Свіслацкага раёна асноўную плошчу тэрыторыі займаюць нізінныя і пераходныя тарфяніста-глеевыя і тарфяна-балотныя почвы – 3337,55 га пры агульнай плошчы землеўладання 4625,70 га.
Самыя вялікія плошчы былі адведзены пад кармавыя культуры, аднагалетнія і шматлетнія травы, сенакосы і пашы.

Увесь прыбытак ад раслінаводства і жывёлагадоўлі ішоў на будаўніцтва жылля для людзей.

А людзі ехалі сюды з усіх рэгіёнаў Савецкага Саюза: Украіны, Расіі, Сібіры, Казахстана. Сярэдні ўзрост жыхароў Корнадзі быў 33-35 гадоў.





Лістапад 1976 г. – быў пабудаваны першы 24-х кватэрны дом.

З кожным годам расце ўшыр вёска Корнадзь, цэнтр саўгаса "50 год Кастрычніка".

У 1977 г. Корнадзьская пачатковая школа была закрыта, вучні былі пераведзены ў Кукліцкую васьмігадовую школу.

У 1978 г. рабочыя саўгаса справілі наваселле ў двух 12-кватэрных дамах.



*Будынак канторы саўгаса "50 год Кастрычніка", 1978г.*

У 1978 г. створана Корнадзьскае наліўное вадасховішча, плошчай 3,18 км. Даўжыня 2,5 км, шырыня да 1,5 км, глыбіня да 3,8 м, сярэдняя 1,95 м. Аб'ём вады 0,21 млн.м. Напаўнялася насосамі з р.Ясельды па водападводнаму каналу. Выкарыстоўвалася для рэгулявання воднага рэжыму сельгасзямель, развядзенне рыбы, а таксама як зона адпачынку.







У 1979 г. был пабудаваны АВМ – агрэгат вітаміннай мукі. Вырашчаныя травы паступалі сюды на перапрацоўку. Ужо гатовая прадукцыя развозілася па ўсёй рэспубліцы.





Вітамінная травяная мука – незаменнае сыр'ё для вытворчасці камбікармоў. Дастатковая сыр'явая база гаспадаркі дазваляла напрацягу ўсяго вясенне-летне-асенняга сезона грануляваць да трох тысяч тон мукі. Чатыры лініі цэха кожную змену выпускалі да 45 тон. У 1987 годзе па выніках рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва за 1986 год сярод гаспадарак па выпуску травяной мукі і яе гранул племсаўгасу "50 год Кастрычніка" прысуджана другое месца з уручэннем граматы Дзяржаграпрама БССР, з уручэннем прэміі: трактар "Беларусь" МТЗ-82 з прыцэпам і прэспадборшчык для цюкавання сена.

Да 1980 г. было пабудавана 17 дамоў на 251 кватэру агульнай плошчай 14459 м$^2$, заканчваецца будаўніцтва дзіцячага сада "Журавінка" на 90 месц, школы, кацельнай, нафтабазы, гаража, склада. Поўным ходам ідзе будаўніцтва камбіната бытавога абслугоўвання, почты, бібліятэкі, бані, а таксама гандлёвага цэнтра.



У 1980 г. адкрылася Корнадзьская базавая школа. У 1982 годзе школа была рэарганізавана ў Корнадзьскую сярэднюю школу. Першы выпуск СШ адбыўся ў 1983 г. (13 вучняў). З 1980 па 1987 гг. – дырэктар школы Анціпкін Іван Міхайлавіч.



У 1982 годзе пабудаваны будынак для ФАПа і музычнай школы.



*Дзеці дашкольнага ўзросту ў дзіцячым садзе “Журавінка” племсаўгаса “50 год Кастрычніка”, 1983г.*

У 1982 г. на палях і лугах саўгаса працавала 57 трактараў, 10 камбайнаў, 6 комплексаў для ўборкі траў, 32 аўтамашыны.



У 1982 г. была пабудавана жывёлагадоўчая ферма на 800 галоў. На малочна-таварнай ферме была паточна-цэхавая сістэма вытворчасці малака. І працавалі даяркі па метаду калектыўнага падрада. Умовы для працы выдатныя. Дойка праводзілася “Елочкой”. Ёсць, дзе адпачыць у вольны час: на тэрыторыі комплекса – Дом жывёлавода. Там можна было пачытаць свежыя газеты, паглядзець тэлевізар, проста папіць чаю.

Усе асноўныя вытворчыя працэсы ў раслінаводстве і жывёлагоўлі у гаспадарцы механізіраваны.



У 1985 г. пачалося будаўніцтва дамоў сядзібнага тыпу.

Разам з першымі навастройкамі ў вёсцы ў 1985 г. быў пабудаваны будынак пральні самаабслугоўвання.





У 1986 г. пры ўездзе ў Корнадзь быў заложаны рукатворны парк. Частка тэрыторыі яго была засажана маладымі дрэўцамі, частка – натуральны прыродны баланс. Упарадкаванне яго дэкаратыўнымі разнымі драўлянымі фігуркамі, асфальтаваныя дарожкі – і парк стаў добрым месцам адпачынку.







У 1987 г. у вёсцы адкрыўся філіял ад Пружанскага радыёзавода.







У 1987 г. пабудаваны Дом культуры на 300 месцаў. Кіназал, танцавальны зал, артыстычная, бібліятэка, гурткавы пакой – месца культурнага адпачынку жыхароў.

На 1 студзеня 1995 г. у Корнадзі пражывала 933 чалавека.

У 2003 г. – 296 гаспадарак, 749 жыхароў.

У 2005 г. Корнадзь першай у раёне палучыла статус аграгарадка. Аграгарадок Корнадзь размешчаны на граніцы Гродзенскай і Брэсцкай абласцей. Знаходзіцца ў 45 кіламетрах ад райцэнтра (г.Свіслач) і у 125 км – ад г.Гродна.

Корнадзь – гэта прывабны аграгарадок, які акружаны лясамі і балотамі. Унікальная прырода, чыстае паветра.



Побач знаходзіцца адзін з унікальных прыродных аб’ектаў, які ўвайшоў у склад Нацыянальнага парка “Белавежская пушча”, – балота “Дзікае”. Частка яго у 1968 г. аб’яўлена гідралагічным заказнікам. Падобных балот у свеце ўсяго толькі чатыры. Тут знаходзіцца водападзел Балтыйскага і Чорнага мораў.

“Дзікае” – адно з найбуйнейшых у свеце нізінных балот, якое захавалася ў стане, блізкім да натуральнага. Гэты балотны масіў – аднагодак егіпецкіх пірамід. Узрост “Дзікага” – каля шасці тысяч гадоў.

Балота насяляюць 14 відаў птушак, 2 віды млекакормячых, 13 відаў насякомых і 14 відаў раслін, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Навукоўцы падлічылі тут чатыры віды рэптылій. З 1700 відаў раслін, якія растуць у Еўропе, каля 680 знайшлі прытулак на гэтым параўнальна невялікім балотным астраўку.

Балота немагчыма ўявіць сабе не толькі без рэдкіх птушак і раслін, але і без журавін.





У 2006 г. аграгарадок Корнадзь забяспечаны сувяззю аператара Velcom.

У 2008-2009 гг. у гаспадарцы пабудавана 11 жылых дамоў сядзібнага тыпу (для работнікаў СВК “Корнадзь”).

На гэты час у аграгарадку дзейнічаюць ГУА ВПК “Дзіцячы сад – базавая школа”, ФАП, бібліятэка, сельскі філіял-клуб, філіял “Корнадзь” Свіслацкай ДШМ, аддзяленне сувязі, два магазіны, баня, участак “Корнадзь” Свіслацкага РУП ЖКГ, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва.

На тэрыторыі аграгарадка знаходзіцца малочна-таварная ферма “Корнадзь” і ферма па вырошчванню пагалоўя мяснога напрамку, дзе ўтрымліваюцца каровы герафордскай пароды. З сакавіка 2012 года гэтыя вытворчыя аб’екты ў ходзе рэарганізацыі СВК “Корнадзь” увайшлі ў склад ПП “Новы Двор-Агра”.

Аграгарадок поўнасцю газіфіцыраваны, ёсць цэнтральнае водазабеспячэнне.

У 2012 г. у Корнадзі пражывала 602 чалавека.

14 чэрвеня 2013 г. гаспадарка перайменавана на УСП “Новы Двор-Агра” (Корнадзь з’яўляецца яе аддзяленнем).

На 2023 г. у Корнадзі – 231 гаспадарка, 434 жыхары. Свае паслугі жыхарам прапануюць сельскі філіял-клуб, бібліятэка-цэнтр эстэтычнага выхавання, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін “Родны кут”, філіял “Корнадзь” Свіслацкай ДШМ, баня, участак “Корнадзь” Свіслацкага РУП ЖКГ.




*Магазін “Родны кут”, 2023 г.*



*Будынак Корнадзьскага ФАПа*
*і аддзялення сувязі “Корнадзь”,*
*2023 г.*



*Корнадзьскі сельскі філіял-клуб, 2023 г.*

Для дзяцей 10-11 класаў арганізаваны падвоз у ДУА “Навадворская сярэдняя школа”.

Аграгарадок звязаны аўтобуснымі маршрутамі з горадам Ваўкавыскам (50 км) і раённым цэнтрам горадам Свіслач (45 км), з абласным цэнтрам міжгародным аўтобусным маршрутам Гродна – Корнадзь (125 км).

